# ЖЫЛЛЁ, ЭНЕРГЕТЫКА І БЛІЗКАЕ ЗНАЁМСТВА



Першы дом у віцебскім Білеве, пабудаваны пры дапамозе КНР.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Гэта — добрыя прыклады супрацоўніцтва з Беларуссю ў рамках фінансава-тэхнічнай дапамогі Паднябеснай у сферы будаўніцтва жылля сацыяльнага прызначэння. Усе выдаткі — ад праектавання да фінансавання будаўніцтва — узяў на сябе кітайскі бок.

Звонку, дарэчы, дом у Білеве на вуліцы акцёраў Яроменкаў нічым не адрозніваецца ад іншых, пабудаваных па аналагічным праекце, адно што на фасадзе ёсць інфармацыя аб дапамозе Кітая.

— Сюды мы засяліліся два гады таму. Раней я, мама і брат жылі на праспекце Чарняхоўскага з бабуляй. У гэтым доме ў нас двухпакаёвая кватэра. Якасць жылля задавальняе, — расказвае **Аляксандр Васіленка.** Ён вучыцца ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, адначасова працуе ў кампаніі мабільнай сувязі.

Маладая мама прадставілася Марыяй, яна расказала, што ў доме добры ліфт, у які без праблем умяшчаецца каляска.

— Гэта зручна... Раней жылі ў кватэры ў доме на вуліцы П. Броўкі ў цеснаце... Тут, канешне, прасторнае жыллё, — кажа гараджанка.

Яшчэ адзін жыхар дома Раман — рабочы дзяржаўнага прадпрыемства.

— Я ў гэтым доме з моманту засялення. Да гэтага жылі з мамай на вуліцы В. Церашковай. Тут у двухпакаёвай кватэры з жонкай і дзіцем. Падабаецца раён, бо вельмі спакойны і побач лес, — паведаміў суразмоўнік.

Вельмі добра пагутарылі з яшчэ адной жыхаркай. **Валянціна Паўлаўна Княжышча** прагульвалася з унучкай, дзяўчынкай з абмежаванымі магчымасцямі. Раней жанчына працавала ў садку. Улічваючы стан здароўя ўнучкі, якой у хуткім часе будзе дзевяць гадоў, цяпер даглядае яе.

Суседзі ў яе пад'ездзе дружныя: разам кветкі высаджваюць каля дома, калі нешта здарыцца, прыходзяць на дапамогу адно аднаму... Стасункі вельмі шчырыя, як у двух народаў: беларускага і кітайскага, кажа жанчына.

У абласным цэнтры гэты прыклад не адзіны. Недалёка ад чыгуначнага вакзала — на вуліцы Ленінградскай — навасёлы не раз добрым словам прыгадаюць клопат з далёкай краіны. Там, таксама ў дзесяціпавярховым доме, у канцы мінулага года справілі наваселле тутэйшыя, якім гарантавана сацыяльная падтрымка. Надзвычайны і Паўнамоцны пасол КНР у Беларусі Цуй Цымін падчас уручэння ключоў падкрэсліў, што будаўніцтва жылля ў Віцебску будзе працягвацца.

## ...І Ў ГЛЫБІНЦЫ

Паралельна з узвядзеннем «метраў» у абласным цэнтры кітайская бязвыплатная будаўнічая дапамога запатрабавана ў глыбінцы.

У прыватнасці, у межах рэспубліканскага праекта «Будаўніцтва сацыяльнага жылля» ў 2017 годзе ў Оршы быў здадзены дзевяціпавярховы 108-кватэрны дом. У Наваполацку мінулай восенню справілі наваселле ў 84-кватэрным доме сацыяльнага прызначэння. Ён пабудаваны па аналагічным «алгарытме». А ў суседнім Полацку гарадскую забудову дапоўніў 92-кватэрны дом-прыгажун. У Лепелі для тутэйшых былі прызначаны 40 кватэр у такім жыллі...

Будаўніцтва па «кітайскай сістэме» працягвалася і ў іншых населеных пунктах Віцебшчыны.

Калі генпадрадчык — кітайская арганізацыя, беларускі бок працуе па субпадрадзе. Жыллё адпавядае беларускім стандартам і па якасці, а тым больш па зручнасці для жыльцоў нічым не адрозніваецца ад «сабратаў» айчыннай вытворчасці.

Жыллё, дарэчы, «інтэлектуальнае»: з сучаснымі сістэмамі вентыляцыі, зберажэння энергіі, з мінімумам небяспекі для навакольнага асяроддзя.



Святлана ЕМЯЛЬЯНАВА з дачкой Карынай цяпер жывуць у новым доме на Ленінградскай.

Фота БелТА.

## «ЭНЕРГАСЦЯНА» НА ДЗВІНЕ

Падчас «Вялікай гутаркі з Прэзідэнтам» у якасці прыкладу паспяховага супрацоўніцтва з КНР кіраўнік дзяржавы назваў гідраэлектрастанцыю на Заходняй Дзвіне.

У 2013 годзе на адной з самых працяглых рэк краіны Кітайская інжынерная кампанія па электраэнергіі (CNEEC) пачала будаўніцтва найвялікшай гідраэлектрастанцыі ў Беларусі. Яна мае чатыры турбіны, кожная з якіх — магутнасцю 10 МВт. Уведзена ў эксплуатацыю яна ў ліпені 2017 года.

Штогод на ГЭС магчыма выпрацоўваць каля 140 мільёнаў кілават-гадзін электраэнергіі. Гэтага, як канстатуюць энергетыкі, з лішкам хопіць, каб забяспечыць патрэбы спажыўцоў Віцебскага раёна і не толькі.

Дарэчы, адна з галоўных водных артэрый краіны на гэтым участку пасля ўзвядзення станцыі засталася суднаходнай. У Віцебскім райвыканкаме адзначаюць, што гэта дазволіць прыцягнуць яшчэ больш аматараў воднага турызму. Магчымасць прайсці знакамітым водным шляхам «З варагаў у грэкі» вабіць усё больш беларусаў і іншаземцаў. Такім чынам, можна будзе выкарыстаць гідраэлектрастанцыю і для арганізацыі актыўнага адпачынку.

## АДЗІН З АСНОЎНЫХ ПАРТНЁРАЎ

Знешнегандлёвае супрацоўніцтва з КНР на Віцебшчыне стабільнае. У сярэднім штогод у гэтую краіну экспартуецца прадукцыі на суму каля дзесяці мільёнаў долараў ЗША. Калі не лічыць супрацоўніцтва з расіянамі, менавіта Кітай традыцыйна знаходзіцца ў пяцёрцы асноўных гандлёвых партнёраў вобласці па аб'ёме тавараабароту разам з Нідэрландамі, Вялікабрытаніяй, Германіяй і Польшчай.

Асноўныя прадпрыемствы-экспарцёры, якія маюць вопыт працы на кітайскім рынку і экспартуюць сваю прадукцыю, — ААТ «Нафтан», ААТ «Полацк-Шкловалакно», Аршанскі льнокамбінат. У КНР таксама высока ацанілі прадукцыю Віцебскага маслаэкстракцыйнага завода, Віцебскага лікёра-гарэлачнага завода «Прыдзвінне», холдынга «Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка» ды іншых. Усяго экспарт прадукцыі ажыццяўлялі каля дваццаці прадпрыемстваў вобласці. А сярэднегадавы аб'ём тавараабароту вобласці з кітайскімі партнёрамі за апошнія пяць гадоў складае каля 120 мільёнаў долараў. Максімальны аб'ём тавараабароту адзначаўся ў 2012—2013 гадах і дасягаў 280 мільёнаў долараў.

Як паведамілі ва ўпраўленні знешнеэканамічнай дзейнасці Камітэта эканомікі Віцебскага аблвыканкама, аснову імпарту з КНР складаюць матэрыялы для вытворчасці абутку, сыравіна для харчовай, лёгкай і хімічнай галін прамысловасці, лекі і паўфабрыкаты, інсектыцыды, інструменты.

Прадпрыемствы-экспарцёры рэгулярна ўдзельнічаюць у міжнародных выстаўках на тэрыторыі Кітая, у прыватнасці ў штогадовай выстаўцы-кірмашы ў Харбіне. У першай Кітайскай міжнароднай выстаўцы імпарту ў Шанхаі, што прайшла ў лістападзе 2018 года, прынялі ўдзел дзесяць прадпрыемстваў Віцебскай вобласці. Там была прадстаўлена прадукцыя нафтахімічнай галіны, мяса-малочная, а таксама льняная. Дарэчы, нядаўна на пасяджэнні аблвыканкама губернатар Мікалай Шарснёў адзначыў, што кітайскі бок агучыў жаданне пабудаваць з нуля льнозавод. Цікава, што дзякуючы крэдытаванню аднаго з банкаў Паднябеснай у 2015—2017 гадах быў рэалізаваны інвестпраект па мадэрнізацыі вытворчасці на Аршанскім ільнокамбінаце. Памер інвестыцый перавысіў 129 мільёнаў рублёў.

## КІТАЙСКАЯ МОВА З ДЗЯЦІНСТВА...

На Віцебшчыне расце колькасць навучэнцаў, якія вывучаюць кітайскую мову ў якасці замежнай. Напрыклад, у бягучым годзе яе асвойваюць больш за 220 школьнікаў з абласнога цэнтра і Оршы. А каля дзесяці ўстаноў адукацыі Аршанскага раёна маюць факультатыўныя заняткі, якія вядуць валанцёры з КНР.

Мінулай восенню пры падтрымцы Пасольства КНР у Беларусі ў віцебскай СШ № 44 адкрыўся першы ў вобласці клас Канфуцыя. Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт паспяхова рэалізуе праект акадэмічнай мабільнасці з Хейлундзянскім універсітэтам. Цяпер у ВНУ-партнёры праходзяць навучанне студэнты гуманітарнага і фінансава-эканамічнага факультэтаў. У Полацкім дзяржуніверсітэце цэнтр Канфуцыя ажыццяўляе дзейнасць па выкладанні мовы, эканомікі і традыцыйнай культуры.

Універсітэтам падпісаны новыя дагаворы аб супрацоўніцтве з Лінаньскім універсітэтам і Ланьчжоўскім транспартным універсітэтам. Згодна з дамоўленасцямі, плануецца стварэнне сумесных праграм навучання, а таксама запрашэнне кітайскіх грамадзян на вучобу ў Беларусь.

Некалькі гадоў у Віцебскім дзяржаўным універсітэце на платнай аснове праводзіцца летняя адукацыйная праграма для кітайскіх студэнтаў. У 2017 годзе ў рамках гадавой культурна-адукацыйнай праграмы вывучалі рускую мову і пазнаёміліся з культурнай спадчынай Беларусі трыццаць студэнтаў з Пекіна.

## ... І АЗДАРАЎЛЕНЧЫЯ ПРАКТЫКІ

Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт (ВДМУ) — адзін з самых паважаных яшчэ з часоў СССР. Ён падтрымлівае сувязі з Куньмінскім медыцынскім універсітэтам. Сюды рэгулярна запрашаюць кітайскіх калег для ўдзелу ў навукова-практычных канферэнцыях, якія праходзяць на базе ўніверсітэта.

Дзейнічае дагавор аб супрацоўніцтве ВДМУ з навукова-тэхнічным інвестыцыйным холдынгам FOHOW. У яго рамках ажыццяўляюцца міждысцыплінарныя напрамкі работы факультэта «Здароўезберажэнне» сумесна з супрацоўнікамі навукова-даследчага інстытута FOHOW.

У рамках праекта «Славянска-кітайскія аздараўленчыя практыкі» працуюць групы здароўя «Цыгун» — для людзей сярэдняга і старэйшага ўзросту. Аднайменны комплекс уведзены па дысцыпліне «Фізічная культура» для студэнтаў спецыяльных медыцынскіх груп з парушэннем апорна-рухальнага апарата і захворваннямі органаў дыхання.

Летась у Віцебскім абласным клінічным цэнтры медыцынскай рэабілітацыі для інвалідаў і ветэранаў-інтэрнацыяналістаў адкрыты Цэнтр традыцыйнай кітайскай медыцыны. На працягу першых дзесяці месяцаў функцыянавання цэнтр наведала каля тысячы пацыентаў.

## КУЛЬТУРА БЕЗ МЕЖАЎ

На базе Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці на працягу мінулага года праводзіліся ўрокі традыцыйнай культуры, майстар-класы для кітайскіх студэнтаў ВНУ Віцебска.

Кітайскі дуэт «Chinese Men» з горада Хух-Хота сумесна са студэнтамі ВДУ імя П. М. Машэрава ўдзельнічаў у XXVII Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

А яшчэ становіцца традыцыйным фестываль «Вясна з вясною сустрэліся», які прайшоў летась у Оршы. Ён сімвалізуе яднанне дзвюх культур — Беларусі і Кітая.

Летась у Віцебскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі з удзелам студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў і школьнікаў прайшоў Дзень кітайскай культуры. Сумесна з дзяржаўным архівам вобласці арганізавана выстаўка «Другая радзіма», якая расказвала пра жыццё кітайцаў на Віцебшчыне і адзіны на тэрыторыі Беларусі кітайскі калгас «Кантонская камуна», што дзейнічаў у 20—30-х гадах мінулага стагоддзя. Як гэта было? Пад Віцебск жыхары Паднябеснай прыехалі не дзеля пошуку экзотыкі. У Кітаі зямлі ў селяніна было мала, пракарміцца нават невялікай сям'і было цяжка. Таму і шукалі магчымасці працаваць за тысячы кіламетраў ад радзімы. Больш за 40 чалавек прыехалі ў Віцебск і наваколле ў 1922-м. Яны браліся за самую цяжкую працу, якой неахвотна займаліся тутэйшыя. У 1928-м каля дзесяці сем'яў атрымалі амаль дваццаць гектараў недалёка ад горада. Кітайцы пачалі вырошчваць агародніну і садавіну, потым заняліся льном. Росквіт гаспадаркі быў у сярэдзіне 1930-х. Цікава, што ў калгасе быў млын — адзіны ў акрузе. Усе пасяленцы жылі заможна, трымалі жывёлу, добра зараблялі сваёй нялёгкай працай, не раз станавіліся героямі публікацый у газетах і часопісах.



Нона МАКАРАВА з сынам Арцёмам і дачкой Дзіянай былі рады прыемнаму падарунку да Новага года.

Фота БелТА.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

З гісторыі пытання

# Дружба, раўнапраўе, узаемная выгада

## Што такое Дырэктыва Прэзідэнта № 5?

...10 мая 2015 года старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін прыляцеў у Беларусь. Пасля афіцыйнай цырымоніі сустрэчы ў Палацы Незалежнасці беларускі і кітайскі лідары правялі перагаворы ў пашыраным фармаце і вузкім складзе, па выніках якіх падпісалі пакет дакументаў. Сярод іх — Дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве паміж Беларуссю і Кітаем, а таксама сумесная дэкларацыя аб далейшым развіцці і паглыбленні адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства.

Акрамя таго, тады ж былі падпісаны два дзясяткі пагадненняў і мемарандумаў — гэта зрабілі прадстаўнікі афіцыйных дэлегацый.

Візіт у Беларусь у старшыні КНР атрымаўся насычаным — і ў фінальны дзень візіту кіраўнікі дзяржаў наведалі месца першага этапу будаўніцтва Кітайска-беларускага індустрыяльнага парку, дзе пакінулі свае подпісы на плане развіцця парку.

Праз некалькі месяцаў пасля знамянальнага візіту і з'явілася Дырэктыва № 5.

Гэта дакумент ад 31 жніўня 2015 года, прысвечаны развіццю двухбаковых адносін Беларусі з Кітайскай Народнай Рэспублікай. У прыватнасці, у Дырэктыве сказана, што развіццё адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства нашай краіны з КНР адпавядае доўгатэрміновым інтарэсам Беларусі і ўмацаванню яе міжнародных пазіцый, спрыяе забеспячэнню развіцця ўсяго спектра беларуска-кітайскага супрацоўніцтва.

Таксама ў дакуменце падкрэсліваецца, што асноўным зместам двухбаковага супрацоўніцтва з'яўляецца ўзаемная рашучая падтрымка па пытаннях, якія датычацца карэнных інтарэсаў дзвюх краін, — суверэнітэт, тэрытарыяльная цэласнасць, бяспека, эканамічнае развіццё.

Дарэчы, у Дырэктыве адзначана, што супрацоўніцтва з КНР ажыццяўляецца на прынцыпах, сярод якіх — раўнапраўе, узаемная выгада, цеснае ўзаемадзеянне дзяржорганаў з кітайскім бокам.

Вызначаны і асноўныя кірункі супрацоўніцтва. Сярод іх — глыбокая інтэграцыя галін прамысловасці і прадпрыемстваў, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, навука і даследаванні, узаемадзеянне рэгіёнаў і іншыя.

Стратэгічны напрамак супрацоўніцтва з КНР — сумеснае развіццё ў гандлёвай, інвестыцыйнай, фінансавай і інавацыйнай сферах, а таксама стварэнне і рэалізацыя сумесных праектаў і прадпрыемстваў.

Асобным органам даручана правядзенне канкрэтных мерапрыемстваў для рэалізацыі прапісаных мэт і задач. Таксама канкрэтныя крокі прапісаны для інвестыцыйнай, фінансавай, гуманітарнай сфер, у галіне навукі і тэхнікі, рэгіянальнага супрацоўніцтва. Безумоўна, асаблівае месца ў дакуменце займае Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень» як найважнейшы элемент удзелу нашай краіны ў будаўніцтве Эканамічнага пояса Шаўковага шляху.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

Кампетэнтны каментарый

# Спяшаемся не спяшаючыся

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Андрэй РЫБАК:**



— Можна па-рознаму ацэньваць рэалізацыю Дырэктывы № 5. Зыходзячы з чаканняў ад супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай, хацелася б большага. Але калі параўноўваць нашы адносіны з іншымі партнёрамі, з той жа Расійскай Федэрацыяй, Еўрасаюзам, з нашымі суседзямі па СНД, то дынаміка, нават у большай ступені, чым з кімсьці, прысутнічае. Магчыма, з Расійскай Федэрацыяй мы дасягнулі такога высокага ўзроўню, што ўжо пачынаюцца нейкія адкочванні. У адносінах з Кітаем ідзём не так хутка, але паступальна. Так, нам хацелася б, каб у Кітайска-беларускім індустрыяльным парку было больш рэзідэнтаў, каб яны запускалі прадукцыю ў вялізных аб'ёмах. На этапе будаўніцтва ёсць ужо нямала рэзідэнтаў, але рэалізаваных праектаў пакуль няшмат. Канешне, іх колькасць павялічваецца. Як чалавечае дзіця трэба вынасіць, як саджанцу трэба вырасці, так і тут — не трэба спяшацца, трэба рабіць усё дакладна, крок за крокам, прыслухоўваючыся да кітайскіх партнёраў.

Не аднойчы мы разам з Саветам Рэспублікі праводзілі па ініцыятыве кітайскага пасольства сустрэчы з кітайскім бізнесам, дзе абмяркоўвалі ўдасканаленне нашага заканадаўства. Безумоўна, што без пэўнай яго ўніфікацыі бізнес наўрад ці далёка прасунецца наперад.

Я для сябе зазначыў, што кітайскі бізнес разумее спрыяльны інвестыцыйны клімат крыху інакш, чым стварэнне вялікіх ільгот і прэферэнцый. Яго прадстаўнікі кажуць пра тое, што часам наша заканадаўства занадта зарэгуляванае. Асабліва яны акцэнтавалі ўвагу на пытаннях працоўнага заканадаўства. Мы надта фармалізуем адносіны паміж работнікам і працадаўцам. Напрыклад, калі Адміністрацыя Кітайска-беларускага парка вырашыла змяніць распарадак працоўнага дня, падладзіўшы яго пад графік руху грамадскага транспарту, спатрэбілася перазаключыць кантракты з кожным работнікам, папярэдзіць яго за месяц, нягледзячы на тое што ўсе згодныя і зменены графік для ўсіх больш зручны. Гэтак жа няпроста прыцягнуць работніка да працы ў выхадны дзень, калі, скажам, прыязджае адказная дэлегацыя.

Калі я іх чую, то разумею, што ў нас так: трэба дык трэба. А ў кітайцаў заканадаўства не настолькі фармалізаванае і разгалінаванае, і яны прывыклі выконваць яго літаральна. Яны бяруць наша, чытаюць і не ведаюць, што рабіць. Неяк я ім прапанаваў рабіць так, як рабіў сам, калі працаваў на прадпрыемстве: работнік можа напісаць, што згодны на змены ў працоўным рэжыме без захавання тэрмінаў папярэджання. Яны вельмі здзівіліся: дзе гэта запісана ў законе?

Мы ствараем спрыяльны інвестыцыйны клімат па сваім разуменні, а яны чакаюць трошкі іншага. Каб зразумець адно аднаго, зносін павінна быць больш. У індустрыяльных парках на тэрыторыі КНР каласальная колькасць рэзідэнтаў — тысячы, і яны не карыстаюцца ніякімі льготамі. Парк стварае інфраструктуру, дае магчымасць кансультацый для пачаткоўцаў і падобнае. Кітайцы лічаць: калі бізнес не здольны выжыць без падатковых ільгот, то ён не патрэбны.

Таму нам не варта спяшацца і чакаць выбуховага росту, важна лепш зразумець адно аднаго, у тым ліку і для развіцця ўласнага заканадаўства.

Калі казаць пра супрацоўніцтва з Кітаем, то трэба згадаць наш праект (лічу, што гэта наш праект) — Групу падтрымкі Шаўковага шляху пры Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, якая была створана ў Мінску. З гонарам магу сказаць, што ад Рэспублікі Беларусь падпісаў пагадненне аб стварэнні гэтай групы. Інтарэс да яе вялікі, яна ўжо аб'ядноўвае 27 краін. Такім чынам мы стараемся ўдзельнічаць у праектах, якія ініцыяваў Кітай, каб быць не толькі ў іх рэчышчы, але і наперадзе.

Я быў удзельнікам абмеркавання ініцыятывы «Пояс і шлях» у Акадэміі грамадскіх навук КНР — гэта адзін з распрацоўшчыкаў ідэі. Дык вось, яе аўтары сцвярджаюць, што не ўсе правільна ініцыятыву разумеюць. Чамусьці чакаюць, што Кітай будзе раздаваць кожнай краіне ўздоўж Шаўковага шляху грошы, і выстраіліся па іх у чаргу. Насамрэч Кітай чакае, калі яму ў адказ прапануюць праекты ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. У Акадэміі грамадскіх навук нам паведамілі, што ўзнікла патрэба распрацоўкі сумеснага дакумента — стратэгіі пабудовы «Пояса і шляху», каб было агульнае разуменне гэтай ініцыятывы. Нам, як адным з самых актыўных удзельнікаў яе рэалізацыі, Кітай прапаноўвае падумаць разам над стварэннем такога дакумента. І на маю думку, для Групы падтрымкі Шаўковага шляху пры ПА АБСЕ такая работа была б лагічнай.

Калі казаць пра паскарэнне ўзаемадзеяння з Кітаем, то трэба разумець і тое, што наша насельніцтва ўважліва сочыць за ўсім новым, за тым, якія гэта новае нясе перавагі і якую рызыку. Людзям трэба расказваць пра дапамогу, якую нам аказвае КНР: пабудову дамоў, стадыёна і басейна... Усё гэта дэманструе добрыя адносіны да нас.

Я шмат меў зносін з Кітаем і падчас сваёй работы на «Беларуськаліі» (гэта наш асноўны пакупнік калійных угнаенняў), і зараз як член парламенцкай рабочай групы па ўзаемадзеянні з КНР. Мы падобныя з Кітаем у пабудове сацыяльнай эканомікі, у тым, што чалавек і ў нас, і ў іх стаіць у аснове ўнутранай палітыкі.

Дырэктыва № 5 прапісвае стварэнне сістэмы рэгулярнага абмену вопытам, і тут мы значна прасунуліся наперад. Ёсць і інвестыцыйныя праекты. Той жа Парк «Вялікі камень» — яго аналагі ёсць далёка не ва ўсіх еўрапейскіх краінах. Увогуле, беларуска-кітайскае партнёрства ўнікальнае. У КНР шмат праектаў у Лацінскай Амерыцы, Афрыцы, але там размова пра пакупку радовішча, здабыванне рэсурсаў. Мы выбудоўваем менавіта праекты доўгатэрміновага і ўзаемакарыснага супрацоўніцтва. Імкнёмся прывезці сюды тэхналогіі, прадаваць свае прадукты там, дапаўняць адно аднаго. У гэтым наша асаблівасць.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**